

ДАСКАНАЛЫ ЗАКОН ПАРАЗУМЕННЯ

Сямейная газета

КОЛЬКІ КАШТУЕ ВЯСЕЛЛЕ?



Сямейная газета


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЖНІЎНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 148 (29517)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«На мінулым тыдні кіраўнік дзяржавы зацвердзіў праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця. Адны з важных паказчыкаў — рост ВУП і заработнай платы. Такія тэмпы могуць быць дасягнутыя пры максімальнай загружанасці магутнасцяў прадпрыемстваў і збыце прадукцыі. Машынабудаванне, апрацоўчая прамысловасць, дрэваапрацоўка, будаўнічыя матэрыялы — усе гэтыя сферы эканомікі развіваюцца даволі інтэнсіўна за кошт росту ўнутранага попыту. Што датычыцца рэальнага сектара эканомікі — тут пытанне ў тым, каб дамагчыся аддачы ад тых інвестпраектаў, якія былі рэалізаваныя ў мінулую пяцігодку. Неабходна працягваць укладваць у тыя аб'екты, якія патрабуюць мадэрнізацыі».*

## КОРАТКА

- Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка возьме ўдзел ва інаўгурацыі прэзідэнта Ірана.
- **Магілёўскі аэраклуб стаў базай падрыхтоўкі да ЧС для нацыянальнай зборнай па парашутным спорце.**
- Ветэрынары заклікаюць вакцынаваць дамашніх жывёл ад шаленства.
- **Дырэктар брэсцкай турфірмы прысвоіла грошы кліентаў і знікла за мяжой.**
- Інспекцыі МПЗ выявілі выпадкі выплаты заробкаў у канверце.
- **Навукоўцы выявілі кветку, якая можа вылечыць ад COVID-19.**
- Вучоныя БДУ пачалі выпуск альтэрнатыўнага дарагім металам шкловугляроду.
- **У сельскай мясцовасці Віцебскай вобласці адкрыюць два стацыянарныя сацпункты ад ТЦСАН.**


ISSN 1990 — 763X


# Бераг клецкі, рыбак івянецкі



У цэнтры Клецка захавалася маляўнічая сажалка, якая здаўна з'яўляецца месцам адпачынку тутэйшых жыхароў. На вадзе наведзены штучны астравок, куды можна трапіць праз масток, упрыгожаны адмысловай ажурнай коўкай. На беразе размясціўся міні-парк, у якім устаноўлены драўляныя скульптуры, выкананыя ўдзельнікамі абласнога пленэру самадзейных разьбяроў. Увагу дапытлівых адпачывальнікаў, асабліва дзяцей, заўсёды прыцягвае фігура старога рыбака, якую зрабіў самабытны скульптар з гарадскога пасёлка Івянец Мікалай Задрэйка.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Шок

## ЗВЕРСТВЫ НА ГРАНІЦЫ

### Літоўцы раскручваюць крывавую хвалю гвалту

**З беларуска-літоўскай граніцы працягваюць паступаць весткі, ад якіх проста кроў стыне ў жылах. Учора стала вядома, што з'явілася першая ахвяра зверстваў літоўскіх пагранічнікаў-катаў.**

Інфармацыя пра невядомага паступіла на пагранічную заставу 3 жніўня прыблізна ў 22.00. Мясцовы жыхар расказаў, што чалавек рухаецца ў раёне населенага пункта Ёткішкі ў бок населенага пункта Воранаўка. «Для праверкі інфармацыі я разам з нарадам адправіўся ў гэтым напрамку, — распавёў **начальнік пагранічнай заставы «Беняконі» Максім ХВАЛЬКО.** — Каля 23.00 у 150 метрах ад дарогі ў поле выявілі чалавека. Ён знаходзіўся ў паўляжачым стане. На пытанні, хто вы такі і што вы тут робіце, выразных адказаў не атрымаў. Мужчына моцна кашляў і задыхаўся».

Стан небаракі імкліва пагаршаўся. Ён закінуўся набок. Пагранічнікі спрабавалі аказаць яму першую дапамогу, а таксама выклікалі «хуткую» , бо пульс не адчуваўся. Медыкі прыбылі на працягу 10 хвілін. Яны канстатавалі смерць мужчыны...

Аб шакавальным забойстве 29-гадовага мігранта (як мяркуецца, іракца), які вяртаўся з Літвы, было тэрмінова даложана Прэзідэнту Беларусі. «Ён даручыў Следчаму камітэту старанна разабрацца ў дадзенай сітуацыі. МЗС і адпаведным структурам — пастарацца адшукаць сваякоў дадзенага грамадзяніна. Трэба з чалавекам паступаць па-чалавечы», — заўважыў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.**


**СТАР. 2**


*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

Глуша Адамовіча

## ПЯЦЬ ПАВЕРХАЎ... АДАМОВІЧА

**Менавіта такой вышыні мурал, прысвечаны пісьменніку, з'явіўся ў Капылі да сёлетняга Дня пісьменства.**




**Пазаўчора мы святкавалі юбілей са дня нараджэння Алеся Адамовіча. Калі б не вайна і не маміна невялічкая хітрасць, якая «памаладзіла» сына ў пасведчанні аб нараджэнні на год, каб яго не сагналі ў Германію, мы б трэцяга жніўня 2021 года адзначылі 95 гадоў з дня нараджэння Алеся Адамовіча. Прыдуманая дата — 3 верасня 1927 года — між тым, стала пашпартнай, увайшла ў энцыклапедыі і «Вікіпедыю». Але родныя і тыя, каму блізкая творчасць пісьменніка, адсвяткавалі яго юбілей сёлета. Адамовіч нарадзіўся ў вёсцы Канюхі Капыльскага раёна, і вельмі прыемна, што ў гэты юбілейны для пісьменніка год у Капылі з'явіўся мурал з яго партрэтам. Вось і не вер пасля гэтага ў прадвызначанасць лёсу! Партрэт малявалі да Дня пісьменства, які сёлета абдудзецца тут, а атрымаўся своеасаблівы падарунак да юбілею.**


**СТАР. 4**